

# *ДА 60-ГОДДЗЯ ВАЛЯНЦІНА МІХАЙЛАВІЧА СЕМЯНЯКІ*

**Дарагі Валянцін Міхайлавіч!**

Так склалася, што Ваша шматгранная асоба гарманічна сумяшчае амплуа палітыка, дэпутата і таленавітага беларускага паэта. Гэтыя іпастасі ўзаемазвязаны. І ў справах дзяржаўных, і ў грамадска-літаратурнай дзейнасці Вам уласцівыя прынцыповасць, добрасумленнасць і максімальная самааддача. Ваша слова палітыка не разыходзіцца са справай. Ваша паэзія гучыць прызнаннем на мове сэрца ў любові да роднага краю, беларускага народу. У аснове Вашай творчай філасофіі – сталая грамадзянская пазіцыя, вернасць ідэалам патрыятызму і гуманізму. Ваш зямны шлях – гэта жыццё чалавека, які цалкам прысвяціў сябе людзям, Радзіме, дзяржаве. У дзень Вашага 60-годдзя жадаем, каб кожны Ваш дзень быў напоўнены цяплом дарагіх сэрцаў і ззяннем родных вачэй. Здароўя і натхнення Вам на доўгія гады, дабрабыту і поспехаў у працы і творчасці. Няхай бяжыць няўмольны час, а аснова Вашага жыцця застаецца нязменнай. ***З ЮБІЛЕЕМ!***

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

**10 ліпеня 2023 года**

